# Зярнятка 18

7 студзеня 2018 г., Свята Хросту Пана, год В

Ты Сын Мой умілаваны, Цябе ўпадабаў Я — Мк 1, 7-11



Ян Хрысціцель прапаведаваў, кажучы: Ідзе за мною мацнейшы за мяне, якому я не варты, нахіліўшыся, развязаць раменьчык на ягоных сандалях. Я хрысціў вас вадою, а Ён будзе хрысціць вас Духам Святым.

І сталася ў тыя дні, прыйшоў Езус з Назарэту, што ў Галілеі, і быў ахрышчаны Янам у Ярдане. І адразу, калі выходзіў з вады, убачыў нябёсы раскрытыя, і Духа, як голуба, сыходзячага на Яго. І пачуўся голас з нябёсаў: Ты Сын Мой умілаваны, Цябе ўпадабаў Я.

*Гэта слова Пана.*

Вы з радасцю будзеце чэрпаць ваду з крыніцаў збаўлення.

# РАЗГАДАЙ КРЫЖАВАНКУ.



## Езус — умілаваны Сын Божы

1. Езус прыйшоў да Яна Хрысціцеля, каб атрымаць ад яго ....... .
2. Калі Езус ахрысціўся, голас з нябёсаў прамовіў: «Ты Сын Мой ....... , Цябе ўпадабаў Я».
3. Рака, у якой Ян ахрысціў Езуса.
4. Хто сыходзіў на Езуса з нябёсаў, калі Ён ахрысціўся ў Ярдане?
5. Ян убачыў, што Дух Божы спускаўся, як ....... .
6. Як назваў Езуса Ян Хрысціцель, калі ўбачыў Яго?
7. Хрост для чалавека — гэта пачатак новага ....... .




**РАЗМАЛЮЙ МАЛЮНАК.**

Спытайся ў сваіх бацькоў, калі і дзе цябе хрысцілі? Як гэта было? Падзякуй Пану Езусу за сакрамэнт хросту.



